Праект звароту.

ДА ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ!

Грамадзяне!

19 кастрычніка 1988 г. у Менску на ўстаноўчым сходзе Беларускага антысталінскага таварыства ўтвораны арганізацыйны камітэт Беларускага Народнага Фронту ў падтрымку перабудовы і дэмакратызацыі "Адраджэньне".

БНФ аб'ядноўвае ўсіх грамадзян рэспублікі, што неабыякавыя да справы перабудовы, дэмакратызацыі і нацыянальнага адраджэньня, незалежна ад партыйнай прыналежнасьці, нацыянальнасьці, рэлігійных перакананьняў.

БНФ выступае за дэмакратычны народны сацыялізм, супраць манаполіі ўлады ў любой сферы жыцьця.

БНФ -- за рэальны сувэрэнітэт Беларусі.

БНФ -- за поўны і публічны рэспубліканскі гаспадарчы разьлік, за падпарадкаваньне эканомікі інтарэсам чалавека.

БНФ -- супраць сталіншчыны і ўсялякага гвалту над чалавечай асобай, за прававую дзяржаву.

БНФ -- за экалягічна чыстую Беларусь.

БНФ -- за адраджэньне нацыянальнай сьвядомасьці беларускага народа, яго мовы, гісторыі і культуры, задавальненьне патрэбаў нацыянальных меншасьцяў Беларусі.

Галоўная сіла супраць якой выступае БНФ -- наяўная адміністрацыйна-бюракратычная сістэма і яе прадстаўнікі.

БНФ дзейнічае праз уплыў на Саветы народных дэпутатаў, вылучэньне ў Саветы сваіх дэпутатаў, працоўныя акцыі, мітынгі і іншыя дэмакратычныя сродкі барацьбы.

Сярод канкрэтных планаў БНФ:

- скасаваньне праекта будаўніцтва Беларускай /Віцебскай АЭС/;
- публікацыя ўсіх дадзеных па забруджанасьці паветра, вады і глебы ва ўсіх рэгіёнах Беларусі;
- наладжваньне працы самастойнай камісіі па кантролю за хімічнай і радыёактыўнай забруджанасьцю харчовых прадуктаў;
- дамагчыся публічнага абмеркаваньня праектаў пераводу рэспублікі на гаспадарчы разьлік;
- дамагацца папярэдняга публічнага абмеркаваньня, а, па неабходнасьці і рэферэндуму, па ўсіх буйных эканамічных, сацыяльных, палітычных праектаў на Беларусі;
- стварэньне мэмарыялаў ахвярам сталіншчыны на Беларусі;
- дамаганьне непасрэднага прадстаўніцтва Беларусі у міжнародных палітычных, эканамічных, культурных, спартовых і інш.арганізацыях.

Грамадзяне!
Стварайце групы падтрымкі БНФ "Адраджэньне"!
Уся ўлада — народу!
Няхай жыве Беларускі Народны Фронт!

Арганізацыйны Камітэт
Беларускага народнага фронту за
перабудову „Адраджэньне".

---

БНФ -- за адраджэнне і дзяржаўнасць
беларускай мовы ~~за развіццё мовы і культур нацыянальнасцяў у~~ усіх
БНФ -- за адраджэнне праўдзівай
навуковай гісторыі Беларусі.
БНФ -- за ўсебаковае развіццё
культуры беларускага народа.
~~БНФ за задавальненне патрэбаў~~
~~нацыянальных меншасцяў Бела-~~
~~прадстаўнікоў усіх нацыяналь-~~
~~насцяў, што жывуць у Беларусі.~~
(мовы і ~~культур~~)
БНФ — за свабоднае развіццё ~~культур~~
усіх нацыянальнасцяў, што жывуць
у Беларусі.